УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”

# ШАРШЭЎСКІ РЫГОР ЮДЭЛЕВІЧ

## ПІЯНІСТ, ПЕДАГОГ, ЗАСЛУЖАНЫ ДЗЕЯЧ МАСТАЦТВАЎ БССР

## 19 ЖНІЎНЯ (1 ВЕРАСНЯ) 1913 Г. – 7 ЖНІЎНЯ 1991 Г.

**ФОНД № 387**

**ВОПІС № 1**

**1931 г. – 1991 г.**

**МІНСК 2018**

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1 ф. 387**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | РУКАПІСЫ Р.Ю. ШАРШЭЎСКАГА | 1 - 8 | 1 |
| 2. | ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ Р.Ю. ШАРШЭЎСКАГА | 9 - 39 | 1 - 5 |
| 2.1. | АСАБІСТЫЯ І СЛУЖБОВЫЯ ДАКУМЕНТЫ | 9 - 27 | 1 - 3 |
| 2.2. | АФІШЫ КАНЦЭРТАЎ Р.Ю. ШАРШЭЎСКАГА | 28 - 39 | 3 - 5 |
| 3. | ДАКУМЕНТЫ, САБРАНЫЯ Р.Ю. ШАРШЭЎСКІМ | 40 - 51 | 5 - 6 |
| 3.1. | ДАКУМЕНТЫ І.М. ШУМІЛІНАЙ (ПІЯНІСТКІ, ВУЧАНІЦЫ Р.Ю. ШАРШЭЎСКАГА) | 40 - 45 | 5 |
| 3.2. | ПРАГРАМЫ І АФІШЫ КАНЦЭРТАЎ | 46 - 51 | 5 - 6 |
| 4. | ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ | 52 - 58 | 6 |
| 5. | ДАКУМЕНТЫ Э.З. ШАРШЭЎСКАЙ | 59 - 64 | 7 |
| 6. | СПІС КНІГ | | |
| 7. | СПІС КНІГ З ДАРОЎНЫМІ НАДПІСАМІ | | |

## Прадмова

Шаршэўскі Рыгор Юдэлевіч (Ільіч) нарадзіўся 19.08. (01.09) 1913 г. у г.Растове-на-Доне. З 1922 г. пачаў займацца ў музычнай школе. У 1928 – 1931 гг. вучыўся ў Растоўскім музычным вучылішчы (клас В.В. Шаўбы). У 1931 г. паступіў у Ленінградскую кансерваторыю імя М.А. Рымскага-Корсакава (клас вядомага педагога, піяніста, прафесара С.І. Саўшынскага). У 1933 г. як выдатнік вучобы атрымаў стыпендыю імя А. П. Барадзіна. У 1936 г. скончыў кансерваторыю і адразу паступіў у аспірантуру (клас У.У. Сафраніцкага). У 1939 г., пасля заканчэння аспірантуры, па размеркаванні прыехаў у Мінск. 10 лістапада 1940 г. рашэннем Вышэйшай атэстацыйнай камісіі УКВШ пры СНК СССР быў зацверджаны ў навуковым званні дацэнта па кафедры спецыяльнага фартэпіяна. У пачатку вайны быў эвакуіраваны ў г. Намаган Узбекскай ССР, а ў жніўні 1943 г. па запрашэнні Саратаўскай кансерваторыі пераехаў ў Саратаў, дзе працягваў педагагічную дзейнасць у якасці выкладчыка класа фартэпіяна. З'яўляўся ўдзельнікам канцэртных брыгад, якія выязджалі з выступленнямі на фронт. У 1945 г. вярнуўся ў Мінск выкладаць у Белдзяржкансерваторыі. З 1948 г. зацверджаны на пасаду выконваючага абавязкі прафесара. У 1983 г. атрымаў званне "Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР", а ў 1984 г. – прафесара.

Р.Ю. Шаршэўскі памёр 07.08.1991 г. у Мінску.

Сваю выканальніцкую дзейнасць Р.Ю. Шаршэўскі пачаў яшчэ ў студэнцкія гады і працягваў яе да 1960-х гг. Шмат выступаў з сольнымі канцэртамі (1939 – 1965), у ансамблях з віяланчалістамі А.К. Уласавым (1939 – 1941), М.Я. Шэндэравым, (1945), скрыпачамі А.Н. Амітонам (1941 ), А.Л. Бяссмертным (1944 – 1945) і інш., прымаў удзел у запісах на радыё. Пачынаючы з 1950-х гг. актыўна гастраляваў з канцэртамі па Беларусі (Віцебск, Гомель, Бабруйск, Мозыр і інш.). У канцэртных праграмах Р.Ю. Шаршэўскага былі шырока прадстаўлены музычныя сачыненні розных напрамкаў: класіка, рамантызм, сучасная музыка. Гэта творы І.С. Баха, Л.ван Бетховена, І. Брамса, Ф. Шапэна, Ф.П. Шуберта, Р. Шумана і інш. Выконваў творы рускіх і савецкіх кампазітараў С.С. Пракоф'ева, С.В. Рахманінава, А.М. Скрабіна, П.І. Чайкоўскага, Д.Д. Шастаковіча і інш. Быў адным з першых выканаўцаў твораў беларускіх кампазітараў В.А. Залатарова, А.К. Клумава, П. П. Падкавырава і інш.

Сваю выканальніцкую дзейнасць Шаршэўскі спалучаў з педагагічнай працай у Белдзяржкансерваторыі і ў Мінскай сярэдняй спецыяльнай музычнай школе пры Белдзяржкансерваторыі. Ён з'яўляўся адным з заснавальнікаў беларускай фартэпіяннай педагогікі, быў не толькі знакамітым выканаўцам, але і выдатным выкладчыкам. Яго вучнямі былі М.І.

Ахвердава, Э.І. Ахрэмчык, Б.М. Бергер, С.П. Бельцюкоў, Г.М. Вагнер, С. Вараўка, І.В. Галачкіна, В.А. Дулаў, У.М. Кузменка, А.С. Ліўшыц, Л.Т. Ліхачэўская, І.М. Лучанок, Э.А. Міянсараў, В.Н. Нехаенка, І.І. Палівода, Е.Г. Пукст, А.З. Рабіновіч, В.Л. Рахленка, А.Ф. Рашчупкін, Б.І. Спектр, Л.С. Талкачова, Н.І. Ташчыліна, Э.М. Тырманд, Н.Ю. Цёмкіна, І.М. Шуміліна і інш.

Дакументы Рыгора Юдэлевіча Шаршэўскага паступілі ў красавіку 1994 г. ад Уладзіміра Міхайлавіча Кузменкі, па даручэнні удавы Э.З. Шаршэўскай (перад ад’ездам у ЗША). У выніку навуковага апісання быў складзены вопіс №1 у колькасці 64 адзінак захоўвання (187 дакументаў) за 1931 – 1991 гг.

Вопіс складаецца з 5 невялікіх раздзелаў.

1. У раздзеле змешчаны рукапісы выканальніцкіх аналізаў музычных твораў, метадычныя распрацоўкі, артыкул і успаміны пра рускага савецкага піяніста і педагога У.У. Сафраніцкага за [1970-я – 1980-я гг.].

2. Раздзел сфарміраваны з 2-х падраздзелаў. У падраздзел 2.1 увайшлі пасведчанні да медалёў, даведкі, выпіскі з загадаў і пратаколаў, водгукі і характарыстыкі на імя Р.Ю. Шаршэўскага, звесткі пра выкладчыцкую і творчую дзейнасць, ганаровыя граматы. Падраздзел 2.2 склалі афішы канцэртаў Р.Ю. Шаршэўскага. Дакумента за 1946 – 1991 гг.

3. Раздзел склалі дакументы, сабраныя Р.Ю. Шаршэўскім, якія сістэматызаваны па тэматычным прынцыпе і храналогіі за 1938 – 1990 гг. У раздзеле – 2 падразделы. Падраздзел 3.1 – дакументы І.М. Шумілінай (вучаніцы Р.Ю. Шаршэўскага) за [1976] – 1982 гг. Падраздзел 3.2 – праграмы і афішы розных канцэртаў, газета “Советский музыкант” з артыкулам К.Х. Аджэмава, выканальніцкае даследаванне “Р. Шуман. Ночные пьесы” М.І. Ахвердавай і інш.

4. Фатаграфіі Р.Ю. Шаршэўскага з роднымі, сябрамі, студэнтамі і інш. сістэматызаваны па храналогіі за 1956 – 1976 гг.

5. У раздзел ўвайшлі дакументы Эміліі Зелікаўны (Захараўны) Шаршэўскай (педагог музычнага вучылішча імя М.І. Глінкі, жонка Р.І. Шаршэўскага). Гэта асабістыя і службовыя дакументы, фатаграфіі за 1951 – 1979 гг.

Прадмову склала — Г. Б. Багамолава
вяд. архівіст
25.01.2018

ПРАТАКОЛ ЭМК №__________

ад "_____"____________20____ г.

ЗАЦВЯРДЖАЮ:

Дырэктар БДАМЛіМ

_____________ Г.В.Запартыка

"_____"____________20____ г.

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. РУКАПІСЫ Р.Ю. ШАРШЭЎСКАГА** | | | | |
| 1 | "Рахманинов. Вариации на тему Шопена". Выканальніцкі аналіз.<br>Сшытак з аўтографам | [1960-я - 1980-я гг.] | 13 | 1 | |
| 2 | "Роберт Шуман и его цикл для фортепиано "Детские сцены", "Произведения вариационной формы в фортепианном творчестве П.И. Чайковского". Выканальніцкі аналіз. Варыянты тэксту.<br>Сшытак з аўтографам, машынапіс | [1960-я - 1980-я гг.] | 88 | 2 | |
| 3 | "Соната до диез минор П.И. Чайковского (к вопросу об интерпритации)". Выканальніцкі аналіз. Варыянты. Няпоўны тэкст.<br>Аўтограф, машынапіс | [1960-я - 1980-я гг.] | 44 | 3 | |
| 4 | "Фантазия Шумана в интерпритации В.В. Софроницкого". Выканальніцкі аналіз. Варыянты.<br>Аўтограф | [1960-я - 1980-я гг.] | 25 | 2 | |
| 5 | "Шостакович. 2-ая фортепианная соната". Выканальніцкі аналіз.<br>Аўтограф | [1960-я - 1980-я гг.] | 10 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 6 | "Из записок педагога-исполнителя". Артыкул.<br>Машынапіс | [1960-я - 1980-я гг.] | 8 | 1 | |
| 7 | "Гордость советского исполнительского искусства (к 70-летию со дня рождения В.В. Софроницкого)". Артыкул.<br>Машынапіс | 1971 | 17 | 1 | |
| 8 | Успаміны пра У.У. Сафраніцкага.<br>Сшытак, аўтограф | [1960-я - 1980-я гг.] | 38 | 1 | |
| | **2. ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ Р.Ю. ШАРШЭЎСКАГА** | | | | |
| | **2.1. АСАБІСТЫЯ І СЛУЖБОВЫЯ ДАКУМЕНТЫ** | | | | |
| 9 | Дакументы Р.Ю. Шаршэўскага аб вучобе ў | 1936 - 1954 | 5 | 5 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Ленінградскай дзяржаўнай кансерваторыі імя М.А. Рымскага-Корсакава (выпіскі з загада, даведкі, пасведчанне) | | | | |
| 10 | Даведкі аб працы Р.Ю. Шаршэўскага ў Намаганскай музычнай школе і музычным вучылішчы | 1943, 1956 | 2 | 2 | |
| 11 | Выпіска з пратакола №37 ад 10 лістапада 1940 г. аб зацвярджэнні Р.Ю. Шаршэўскага ў вучоным званні дацэнта па кафедры "спеціяльнае фартэпіяна" | 1943 | 1 | 1 | |
| 12 | Пасведчанні Р.Ю. Шаршэўскага да медалёў і знака "За отличную работу", аб прысваенні звання "Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР". Арыгіналы і копіі | 1946 - 1984 | 9 | 4 | |
| 13 | Загады Упраўлення па справах мастацтва пры Савеце Міністраў БССР, Міністэрства культуры БССР і інш. аб прэміраванні, аб'яўленні падзякі і інш. Р.Ю. Шаршэўскага | 1946 - [1975] | 6 | 3 | |
| 14 | Дакументы Р.Ю. Шаршэўскага ў ВАК на прысваенне яму звання прафесара (водгукі і характарыстыкі) | 1947 - 1955 | 6 | 6 | |
| 15 | Дакументы Р.Ю. Шаршэўскага ў ВАК на прысваенне яму звання прафесара (выпіскі з пратаколаў, даведкі, характарыстыкі) | 1960 - 1961 | 11 | 9 | |
| 16 | Выпіскі з пратаколаў дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі Белдзяржкансерваторыі, аб экзаменах студэнтаў Р.Ю. Шаршэўскага | 1961 - 1976 | 5 | 5 | |
| 17 | Спісы аспірантаў, асістэнтаў-стажораў, лаўрэатаў і дыпламантаў конкурсаў, піяністаў, якія займаліся і скончылі Белдзяржкансерваторыю (клас Р.Ю. Шаршэўскага) | 1962 - 1983 | 4 | 3 | |
| 18 | Звесткі пра выкладчыцкую і творчую дзейнасць Р.Ю. Шаршэўскага ў Белдзяржкансерваторыі | [1965 - 1988] | 10 | 4 | |
| 19 | Дакументы Р.Ю. Шаршэўскага ў ВАК на прысваенне яму звання прафесара (водгукі і характарыстыкі) | 1975 - 1976 | 7 | 7 | |
| 20 | Дакументы Р.Ю. Шаршэўскага ў ВАК на прысваенне яму звання прафесара (водгукі і характарыстыкі, выпіскі з пратаколаў, даведкі) | 1983 - 1984 | 15 | 9 | |
| 21 | Выпіскі з працоўнай кніжкі Р.Ю. Шаршэўскага | 1988 | 2 | 2 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 22 | Характарыстыка кіраўніцтва Белдзяржкансерваторыі на заслужанага дзеяча мастацтваў БССР, прафесара кафедры спецыяльнага фартэпіяна Р.Ю. Шаршэўскага | [1980-я гг.] | 3 | 1 | |
| | *    *    * | | | | |
| 23 | Ганаровыя граматы выканкама Саратаўскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных, Прэзідыума ЦК прафсаюзаў работнікаў культуры  і інш. Р.Ю Шаршэўскаму за актыўную працу па культурнаму шэфству над Узброенымі сіламі СССР | 1944 - 1958 | 4 | 3 | |
| 24 | Ганаровая грамата і грамата Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Р.Ю. Шаршэўскаму ў сувязі з 30-годдзем БССР і дэкадай беларускага мастацтва і літаратуры ў г. Масква | 1949, 1955 | 4 | 2 | |
| 25 | Ганаровыя граматы Белдзяржкансерваторыі, Міністэрства культуры БССР і БРК прафсаюза работнікаў культуры і інш. Р.Ю. Шаршэўскаму за плённую працу | 1962 - 1988 | 17 | 8 | |
| | *    *    * | | | | |
| 26 | Віншавальны адрас ад былых вучняў Р.Ю. Шаршэўскаму ў сувязі з 60-годдзем з дня нараджэння. З аўтографамі | 1973 | 2 | 1 | |
| 27 | Віншавальныя тэлеграмы Белдзяржкансерваторыі, А.А. Друкта, В.У. Роўды, Ю.А. Левіціна Р.Ю. Шаршэўскаму з 70-годдзем з дня нараджэння і ад міністра культуры БССР Ю.М. Міхневіча з прысваеннем ганаровага звання "Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР" | 1983 | 5 | 5 | |
| | **2.2. АФІШЫ КАНЦЭРТАЎ Р.Ю. ШАРШЭЎСКАГА** | | | | |
| 28 | Афіша канцэрта выпускнікоў Дзяржмузтэхнікума класа В.В. Шаўбы піяністаў К.Х. Аджэмава і Р.Ю. Шаршэўскага (г. Растоў-на-Доне) | 1931 | 1 | 1 | |
| 29 | Афіша справаздачнага канцэрта прафесарска-выкладчыцкага складу Белдзяржкансерваторыі з удзелам Р.Ю. Шаршэўскага | 1947 | 1 | 1 | |
| 30 | Афішы канцэртаў Р.Ю. Шаршэўскага ў Белдзяржкансерваторыі да 100-годдзя з дня смерці Р. Шумана і інш. | 1950 - 1956 | 4 | 4 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | * * * | | | | |
| 31 | Афішы канцэртаў студэнтаў фартэпіяннага факультэта Белдзяржкансерваторыі і навучэнцаў музычнай школы-дзесяцігодкі з удзелам класа Р.Ю. Шаршэўскага | 1948, 1949 | 2 | 2 | |
| 32 | Афішы канцэрта з твораў студэнтаў кампазітарскага факультэта Белдзяржкансерваторыі і справаздачнага канцэрта навучэнцаў фартэпіяннага аддзялення ССМШ пры Белдзяржкансерваторыі | 1950, 1978 | 2 | 2 | |
| 33 | Афішы канцэртаў "Музыкальные вечера - трудящимся столицы", "Клод Дебюсси" у Белдзяржкансерваторыі з удзелам студэнтаў Р.Ю. Шаршэўскага | 1964 - 1968 | 3 | 3 | |
| 34 | Афішы канцэртаў дыпламанта ўсесаюзнага конкурсу І.І. Паліводы ў Белдзяржфілармоніі і лаўрэата міжрэспубліканскага конкурса піяністаў імя М.К. Чурлёніса Ганны Рабіновіч (вучні Р.Ю. Шаршэўскага) | 1973, 1976 | 2 | 2 | |
| 35 | Афішы канцэртаў у Белдзяржкансерваторыі студэнтаў Р.Ю. Шаршэўскага: У.А. Дулава, А.С. Ліўшыц, А.Ф. Рашчупкіна, Н.І. Ташчылінай і інш. | 1975 - 1985 | 5 | 5 | |
| 36 | Афіша канцэрта "Фортепианная музыка композиторов социалистических стран" студэнтаў Р.Ю. Шаршэўскага у Белдзяржкансерваторыі. Папера, фламастэр | 1981 | 1 | 1 | |
| 37 | Афіша канцэрта "Вечер фортепианной музыки" у выкананні студэнтаў Р.Ю. Шаршэўскага у Белдзяржкансерваторыі. Папера, гуаш | [1975 - 1985] | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 38 | В. Сканаві "Гости из Белоруссии", С. Хентава "Нити творческих связей" і інш. Артыкулы з упамінаннем Р.Ю. Шаршэўскага. Выразкі з газет, копія газетнай выразкі | 1969 - [1970-я гг.] | 3 | 3 | |
| | * * * | | | | |
| 39 | Афіша канцэрта памяці заслужанага дзеяча мастацтваў, прафесара Р.Ю. Шаршэўскага з удзелам У.А. Дулава, А.Ф. Рашчупкіна, Б.І. Спектара, | 1991 | 1 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | І.М. Шумілінай і інш. у Белдзяржкансерваторыі | | | | |

### 3. ДАКУМЕНТЫ, САБРАНЫЯ Р.Ю. ШАРШЭЎСКІМ

#### 3.1. ДАКУМЕНТЫ І.М. ШУМІЛІНАЙ (ПІЯНІСТКІ, ВУЧАНІЦЫ Р.Ю. ШАРШЭЎСКАГА)

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 40 | Запрашэнне на творчы вечар І.М. Шумілінай | [1976] | 2 | 1 | |
| 41 | Афішы канцэртаў І.М. Шумілінай ў Белдзяржфілармоніі | 1976 - [1980-я гг.] | 3 | 3 | |
| 42 | Праграмы сольных канцэртаў І.М. Шумілінай у Белдзяржфілармоніі | 1976 - 1982 | 12 | 4 | |
| 43 | Праграмы канцэртаў, прысвечаных 60-годдзю Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі, канцэрта майстроў мастацтва Польскай народнай рэспублікі і БССР і інш. з удзелам І.М. Шумілінай | 1977 - 1979 | 11 | 4 | |

*  *  *

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 44 | "Фарбы поўнай мерай". Артыкул і нататка пра І.М. Шуміліну (з упамінаннем Р.Ю. Шаршэўскага). Выразкі з газет | 1976, 1982 | 2 | 2 | |

*  *  *

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 45 | Фатаграфіі І.М. Шумілінай | [1980-я гг.] | 4 | 4 | |

#### 3.2. ПРАГРАМЫ І АФІШЫ КАНЦЭРТАЎ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 46 | Праграмы канцэртаў фартэпіяннага вечара У.У. Сафраніцкага ў вялікай зале Ленінградскай дзяржаўнай філармоніі, Э.Р. Гілельса ў Белдзяржфілармоніі і інш. | 1938, 1969 - 1990 | 10 | 5 | |
| 47 | Афішы канцэрта Н. Ляльчук у музычнай школе-дзесяцігодцы пры Белдзяржкансерваторыі "Koncerty przyjazni" ("Канцэрты сяброўства") у драматычным тэатры г. Плоцка (Польшча), пятай міжрэспубліканскай канферэнцыі музычных вучылішчаў, прысвечанай 50-годдзю БССР і КПБ (г. Мінск) | [1950-я гг. - 1963] - 1988 | 3 | 3 | |
| 48 | Афіша канцэрта класа С.І. Саўшынскага ў малой залі Ленінградскай дзяржаўнай кансерваторыі | 1968 | 1 | 1 | |

*  *  *

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 49 | К.Х. Аджэмаў. "По Парижу". Артыкул. | | 2 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Газета "Советский музыкант" №21 - 22 за 22.09.1965 з надпісам аўтара Р.Ю. Шаршэўскаму | | | | |
| 50 | М.І. Ахвердава. "Р. Шуман. Ночные пьесы". Выканальніцкае даследаванне. З дароўным надпісам Р.Ю. Шаршэўскаму ад 27.02.1971 г. Машынапіс з уклейкамі ў пераплёце | 1970 | 41 | 1 | |
| 51 | Інтэрв'ю А. Рубінштэйна карэспандэнту часопіса "The Observer Magazine" ["Назіральнік"] змешчанага ў часопісе "За рубежом" №2 за 1975 г. Рукапісная копія | | 1 | 1 | |
| | **4. ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ** | | | | |
| 52 | Фатаграфія Р.Ю. Шаршэўскага разам з жонкай Э.З. Шаршэўскай, сынам Іллёй і дачкой Розай і інш. | [1950-я - 1980-я гг.] | 3 | 3 | |
| 53 | Фатаграфія І.Р. Шаршэўскага (сына), у групе з выкладчыкамі і выпускнікамі сярэдняй спецыяльнай музычнай школы пры Белдзяржкансерваторыі | [1972] | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 54 | Фатаграфіі выкладчыкаў і выпускнікоў Белдзяржкансерваторыі: А.В. Багатырова, І.І. Жыновіча, Л.С. Мухарынскай, Р.Ю. Шаршэўскага і інш. | 1956, 1961 | 2 | 2 | |
| 55 | Фатаграфіі выкладчыкаў і выпускнікоў Мінскай музычнай школы-дзесяцігодкі пры Белдзяржкансерваторыі: М.А. Бергера, І.Г. Германа, М.Ф. Маслава, І.А. Цвятаевай, Р.Ю. Шаршэўскага і інш. | 1957, 1963 | 2 | 2 | |
| 56 | Фатаграфіі М.С. Васкрасенскага, Т.М. Ніжнікавай, Р.Ю. Шаршэўскага і інш. з удзельнікамі пятага рэспубліканскага конкурсу маладых выканаўцаў у Белдзяржкансерваторыі | 1976 | 8 | 8 | |
| 57 | Фатаграфіі Р.Ю. Шаршэўскага разам з А.П. Мільто, Э.А. Міянсаравым, У.М. Кузменкам, І.М. Шумілінай і інш. | [1960-я - 1980-я гг.] | 5 | 5 | |
| | * * * | | | | |
| 58 | Фатаграфіі М.А. Балакірава, Р.Р. Гінзбурга, А.Б. Гольдэнвейзера, Я.І. Зака [1882, 1930-я - 1950-я гг.] Копіі | [1970-я - 1980-я гг.] | 4 | 4 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **5. ДАКУМЕНТЫ Э.З. ШАРШЭЎСКАЙ** | | | | |
| 59 | Ганаровыя граматы і граматы Міністэрства вышэйшага, сярэдня-спецыяльнага і прафесійнага навучання БССР, Міністэрства культуры БССР і БРК прафсаюза работнікаў культуры і інш. Э.З. Шаршэўскай за поспехі ў педагагічнай дзейнасці | 1964 - 1979 | 20 | 9 | |
| 60 | Афіша канцэрта ў Мінскім музычным вучылішчы імя М.І. Глінкі, прысвечанага 95-годдзю з дня нараджэння У.І. Леніна (уступнае слова Э.З. Шаршэўскай) | 1965 | 1 | 1 | |
| 61 | Кніжка нагруднага знака Э.З. Шаршэўскай "Отличник культурного шефства над Вооружёнными силами СССР" | 1968 | 5 | 1 | |
| 62 | Загад аб аб'яўленні падзякі Э.З. Шаршэўскай за шматгадовую працоўную і музычна-педагагічную дзейнасць у сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння | 1974 | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 63 | Фатаграфіі выкладчыкаў і выпускнікоў Белдзяржкансерваторыі: А.В.Багатырова, В.А.Белага, А.Л.Бяссмертнага, М.А.Бергера, Я.Э.Віцінга, Э.З.Шаршэўскай і інш. | 1951 | 1 | 1 | |
| 64 | Фатаграфія Э.З. Шаршэўскай у групе з выкладчыкамі і выпускнікамі музычнага вучылішча імя М.І. Глінкі | 1978 | 1 | 1 | |

У дадзены вопіс унесена 64 (шэсцьдзесят чатыры)

спраў з № 1 па № 64 , 187 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку
фонда зрабіла

______________________

Дакументы прынялі:

______________________

______________________

"_____"____________20____ г.